**Заключение.** Система физического воспитания в высшей школе постоянно совершенствуется на основе научной и научно-методической работы. Широкое применение в учебном процессе студентов современных компьютерных технологий позволит расширить арсенал методических приемов, стимулировать познавательную деятельность студентов, особенно при самостоятельной работе. Создание и внедрение в учебный процесс компьютерных программ с элементами графики, звука, видео и т.д. будет способствовать эффективности педагогического труда и процесса обучение в целом.

Литература

1. Воронов, И.А. Информационные технологии в физической культуре и спорте: учеб. пособие для студентов высш. учеб. заведений, обучающихся по специальности 032101 "Физическая культура и спорт" / И. А. Воронов. - Санкт-Петербург: Изд-во СПбГУП, 2007. - 139 с.

2. Петров, П.К. Информационные технологии в физической культуре и спорте: учебное пособие / П.К. Петров. – М.: Издательский центр «Академия», 2008. – 288 с.

3. Пороховская М.В. Анализ использования информационно-коммуникационных технологий в сфере физической культуры и спорта / Пороховская М.В. // Вестник ВГУ. – 2015. - № 2 (86-87). с. 99-108

4. Пороховская М.В. Анализ применения компьютерных программ в оздоровительной физической культуре студентов: / М.В. Пороховская // Оздоровительная физическая культура молодежи: актуальные проблемы и перспективы: материалы II Междунар. науч.-практ. конф. (Минск, 2–3 апр. 2015 г.). под. ред.: К.Ю. Романова, Е.С. Ванда. – Минск: БГМУ, 2015. - С. 311-314

5. Самсонова, А.В. Использование информационных технологий в физической культуре и спорте / А.В. Самсонова, И.М. Козлов, В.А. Таймазов //Теория и практика физической культуры, 1999.- № 9.- С. 22-26

УДК 796.011.3:377

# ПАВЫШЭННЕ ЭФЕКТЫЎНАСЦІ ПРАКТЫЧНАЙ ПАДРЫХТОЎКІ НАВУЧЭНЦАЎ КАЛЕДЖА СПЕЦЫЯЛЬНАСЦІ 2-01 01 01 ДАШКОЛЬНАЯ АДУКАЦЫЯ ПА СПЕЦЫЯЛІЗАЦЫІ «ФІЗІЧНАЕ ВЫХАВАННЕ»

**Т.А. Шніпава**

*Полацкі каледж ВДУ імя П.М. Машэрава, Рэспубліка Беларусь*

e-mail: tshnipova@gmail.com

Анатацыя. Асноўнымі мэтамі сістэмы адукацыі сярэдняга спецыяльнага і прафесійнага навучання з’яўляецца падрыхтоўка канкурэнтназдольных спецыялістаў і стварэнне ўмоў для іх усебаковага развіцця ў працэссе навучання і забеспячэнне іх мабільнасці. У цяперашні час адукацыйны працэс на першай ступені адукацыі павінны ажыццяўляць высокакваліфікаваныя спецыялісты, здольныя хутка адаптавацца ў жыццёвых сітуацыях, самастойна набываць неабходныя веды і ўмела іх выкарыстоўваць на практыцы, самастойна крытычна мысліць, быць здольнымі генераваць новыя ідэі. Гэтымі кампетэнцыямі навучэнцы авалодваюць у першую чаргу на вучэбных занятках, а таксама ў час праходжання педагагічнай практыкі.

На сучасным этапе развіцця дашкольнай адукацыі вялікае значэнне надаецца фізічнаму выхаванню дзяцей дашкольнага ўзросту і умацаванню іх здароўя. Аздараўленне дзяцей – адна з прыярытэтных сацыяльных праблем. Гата звязана с тым, что пастаянна павялічваецца колькасць дзяцей з адхіленнямі ў стане здароўя і фізічнай падгатоўленасці. Вядучая роля ў ажыццяўленні гэтай задачы належыць кіраўніку па фізічнаму выхаванню. Работа гэтага спецыяліста – працэс складаны і шматгранны, які патрабуе комплекснага рашэння аздараўленчых, адукацыйных задач у цеснай узаемасувязі с дасягненнямі медыка-біялагічных, псіхолага-педагагічных і спецыяльных навук.

Сучасная дашкольная адукацыя патрабуе якаснай падрыхтоўкі спецыялістаў гэтай сферы, фарміравання іх прафесійных кампетэнцый. Удасканаленне падрыхтоўкі спецыялістаў у галіне фізічнага выхавання непарыўна звязаназ рэалізацыей сістэмна-цэласнага, кампетэнтнаснага і дзейнаснага падыходаў да адукацыі.

Ключавыя словы: навучэнцы, кампетэнцыі, практыка, прафесійная дзейнасць, фізічнае выхаванне, кіраўнік па фізічнаму выхаванню

# INCREASING THE EFFICIENCY OF THE PRACTICAL TRAINING OF COLLEGE STUDENTS ON THE SPECIALTY 2 – 01 01 01 "PRESCHOOL EDUCATION" WITH THE SPECIALIZATION "PHYSICAL EDUCATION"

**T.A. Shnipava**
*Polotsk College of VSU named after P. M. Masherov, Republic of Belarus*

Abstract. The main goals of the education system of secondary special and professional training are the training of competitive specialists and the creation of conditions for their comprehensive development in the learning process and ensuring their mobility. Currently, the educational process at the first level of education should be carried out by highly qualified specialists who can quickly adapt to life situations, independently acquire the necessary knowledge and skillfully use it in practice, independently think critically, and be able to generate new ideas. Pupils master these competencies primarily during training sessions, as well as during pedagogical practice.
At the current stage of development of preschool education, great importance is attached to the physical education of preschool children and strengthening their health. Children's health is one of the priority social problems. This is due to the fact that the number of children with disabilities in health and physical fitness is constantly increasing. The leading role in the implementation of this task belongs to the head of physical education. The work of this specialist is a complex and multifaceted process that requires a complex solution of health and educational tasks in close connection with the achievements of medical-biological, psychological-pedagogical and special sciences.
Modern preschool education requires high-quality training of specialists in this field, formation of their professional competencies. Improving the training of specialists in the field of physical education is inextricably linked with the implementation of system-integrated, competent and active approaches to education.
Keywords: students, competences, practice, professional activity, physical education, head of physical education

На сучасным этапе ў кантэксце аднаўлення адуацыйных стандартаў, праграм, матадаў і форм навучання неабходна старанна і абгрунтавана адбіраць змест адукацыі, педагагічныя тэхналогіі, матадычныя рэкамендацыі і дапаможнікі.

Актуальнасць гэтага напрамка таксама асабліва важная ў перыяд скарачэння тэрмінаў навучання (2 гады 10 месяцаў на аснове агульнай базавай адукацыі і 1 год 10 месяцаў – на аснове агульнай сярэдняй адукацыі), дапаўненняў у адукацыйны стандарт Рэспублікі Беларусь для сярэняй спецыяльнай адукацыі па спецыяльнасці «Дашкольная адукацыя» (кваліфікацыя «Выхавацель дашкольнай адукацыі») [1, с.24, 30]. Канкрэтызаваны ўзроўні ўяўленняў, разумення, уменняў у раздзеле «Патрабаванні да ўзроўню падрыхтоўкі выпускніка», «Патрабаванні да кампетэнцый па кампанентах, цыклам, абласцям ведаў». Гэта дазваляе выпускнікам быць канкурэнтназдольным на рынку працы.

Вучэбная практыка па спецыялізацыі выступае адной з галоўных элементаў прафессійна-падагагічнай падрыхтоўкі навучэнцаў спецыяльнасці 2-010101 «Дашкольная адукацыя» да работы ў якасці кіраўніка па фізічнаму выхаванню ва ўстанове дашкольнай адукацыі.

Гэты від практыкі  набліжае будучых спецыялістаў да іх прафесійнай дзейнасці ў галіне фізічнага выхавання дашкольнікаў і забяспечвае лагічнае ўдасканаленне атрыманых тэарэтычных ведаў у самастойнай працы.

У працэсе праходжання вучэбнай практыкі па спецыялізацыі «Фізічнае выхаванне» навучэнцы маюць магчымасць авалодаць методыкай правядзення розных форм работы па фізічнаму выхаванню с дзецьмі розных узроставых груп. Яны практычна авалодваюць тэхнікай паказа і тлумачэння розных рухаў, правільнага выкарыстоўвання спецыяльнай тэрміналогіі, каманд, распараджэнняў, славеснай інструкцыі і другія прыемы навучання выхаванцаў.

Навучэнцы каледжа набываюць уменні вывучэння рухальных магчымасцей выхаванцаў, складання індывідуальных праграм іх фізічнага развіцця, правільна падбіраць практыкаванні, прадумваць варыянты фізічнай нагрузкі, ажыццяўляць індывідуальную карэкцыную работу.Таксама навучэнцы набваюць вопыт  забеспячэння  бяспекі на занятках, даведваюцца аб тэхнічных характарыстыках трэнажораў і асаблівасці іх выкарыстоўвання, вучацца ўжываць музычнае суправаджэнне ў адпаведнасці з задачамі заняткаў і асаблівасцямі фізічных практыкаванняў.

Практыка па спецыялізацыі 2-01 01 01 31 Фізічнае выхаванне надае магчымасць навучэнцам праверыць набытыя ў каледжы тэарэтычныя веды, адпрацаваць прафесійныя практычныя уменні і навыкі, сфарміраваць цэласнае ўяўленне аб рабоце кіраўніка па фізічнаму выхаванню ва ўстанове дашкольнай адукацыі, а таксама яна дазваляе развіць педагагічныя магчымасці і здольнасці, праявіць ініцыятыву і творчасць, убачыць перспектыву.

Вядучым сродкам паспяховай падрыхтоўкі навучэнцаў у галіне фізічнай культуры з’яўляецца педагагічная практыка, якая  арганізуецца ва ўмовах  максімальна набліжаных да прафесінай дзейнасці.

Шматгадовы вопыт паказвае, что будучыя кіраўнікі фізічнага выхавання не заўседы якасна выконваюць тыя патрабаванні, якія да іх прад’яўляюцца ў час праходжання практыкі ва ўмовах устаноў дашкольнай адукацыі. Асабліва гэта праяўляецца ў афармлені дакументацыі па планаванню дзейнасці, складанню канспектаў  заняткаў з выхаванцамі дашкольнага ўзросту, педагагічным аналізе гімнастыкі і заняткаў па фізічнай культуры. Таксама цяжкасці ўзнікаюць і пры планаванні розных форм работы па фізічнаму выхаванню (заняткі спартыўных секцый, фізкультурныя забавы і г.д.).

**Мэта даследвання:** вывучэнне найбольш эфектыўных форм практычнай падрыхтоўкі будучых спецыялістаў на вучэбнай практыцы па спецыялізацыі «Фізічнае выхаванне».

**Матэрыял і метады:** асноўнымі метадамі даследвання выступаюць апісальны метад і метад сістэмнага аналізу.

Каб павысіць эфектыўнасць адукацыйнага працэса, навучэнцам варта навучыцца складаць канспекты ранішніх гімнастык, фізкультурных заняткаў і забаў, своечасова і правільна весці дзённік практыканта і г.д. Да некаторага часу дзённікаў па гэтаму віду практыкі не было: навучэнцам прапаноўваліся метадычныя рэкамендацыі, якія вызначалі структуру, змест і парадак афармлення абавязковай справаздачы, асабістыя заданні, якія яны выконвалі і  потым захоўвалі ў сябе.

На паседжанні цыклавой камісіі было прынята рашэнне распрацаваць дзённік па спецыялізацыі 2-01 01 01 31 Фізічнае выхаванне, які з’явіўся бы сродкам педагагічнай самаадукацыі і самавыхавання будучага кіраўніка па фізічнаму выхаванню. Дзённік быў распрацаваны на аснове вучэбнага плана па спецыяльнасці і праграммы практыкі і з’яўляецца абавязковым дакументам-справаздачай навучэнца.

Сістэматычнае вядзенне дзённіка дапамагае навучэнцам асэнсаванню сваёй падагагічнай работы, фарміраванню уменняў бачыць кожнае дзіця ва ўзаемаадносінах з аднагодкамі і групай, самастойна крытычна адносіцца да педагагічных фактаў і з’яў, іх педагагічнага аналіза, развіцця педагагічнай назіральнасці і навыкаў самааналіза. Педагагічны дзённік – гэта рабочы дакумент навучэнца.

У ім фіксуюцца: план работы і заданні на кожны дзень практыкі, аналізуецца кожны дзень і кожны від работы, робяцца абагульненні, вывады. Педагагічны дзённік прызначаны для назапашвання метадычных матэрыялаў, метадаў і прыёмаў работы з выхаванцамі, навінак у галіне фізічнага выхавання, якія выкарыстоўваюцца ва ўстанове дашкольнай адукацыі

Таксама адной з форм прафесійнай падрыхтоўкі навучэнцаў і павышэння кваліфікацыі педагогаў, трансляцыі педагагічнага вопыту, які дэманструе методыку

выкладання, тэхналогію навучання і выхавання, з'яўляецца «адкрытыя дні практыкі» па спецыялізацыі 2-01 01 01 31 Фізічнае выхаванне.

Пад час «адкрытага дня практыкі» навучэнцы рыхтуюць канспекты ранішніх гімнастык і фізкультурных заняткаў, усе прысутныя вывучаюць расрацоўкі па тэме, абмяркоўваюць атрыманыя вынікі, выказваюць свае прапановы па вырашэнню праблем. Пад час арганізацыі такой формы работы настаўнік стараецца задзейнічаць усіх навучэнцаў, каб яны змаглі праявіць сябе, паказаць свае здольнасці.

Адкрыты дзень практыкі па спецыялізацыі дазваляе падагогу выкарыстоўваць разнастайныя метады арганізацыі і ажыццяўлення вучэбна-пазнавальнай дзейнасці, мытады стымулявання і матывацыі, кантролю і самакантролю за эфектыўнасцю вучэбна-пазнавальнай дзейнасці навучэнцаў.

Кожны год на першым паседжанні цыклавой камісіі плануюцца адкрытыя дні практыкі на навучальны год, у тым ліку і па спецыялізацыі 2-01 01 01 31 Фізічнае выхаванне. За апошнія гады праведзены адкрытыя дні практыкі па спецыялізаыі па наступных тэмах: «Правядзенне фізкультурных заняткаў па аўтарскім методыкам з уключэннем нестандартнага фізкультурнага абсталявання, нетрадыцыйных відаў фізічных практыкаванняў у розных узроставых групах», «Самастойнае правядзенне ранішняй гімнастыкі і розных відаў фізкультурных заняткаў з выхаванцамі розных узроставых груп» і г.д.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Для вызначэння эфектыўнасці выкарыстоўвання педагагічнага дзённіка было правдзена анкетаванне навучэнцаў. Пытанні анкеты складзены такім чынам, каб выявіць узровень задаволенасці навучэнцаў пры выкарыстоўванні дзённіка ў працэсе практыкі па спецыялізацыі.

Адказваючы на пытанне «Падабаецца Вам выкарыстоўваць педагагічны дзеннік у якасці дакумента-справаздачы?» 87% навучэнцаў адказалі станоўча, а 13% - адмоўна. Каля 15% рэспандэнтаў на першых этапах выкарыстоўвання дзённіка сутыкаліся з цяжкасцямі іх афармлення. 100% навучэнцаў лічаць, что праектаванне кожнага дня практыкі з выкарыстоўваннем дзённіка больш эфектыўнае.

Маніторынг якасці падрыхтоўкі навучэнцаў спецыяльнасці 2-01 01 01 Дашкольная адукацыя спецыялізацыі 2-01 01 01 31 Фізічнае выхаванне з выкарыстоўваннем розных актыўных форм узаемадзеяння, які пастаянна адсочваецца настаўнікамі цыклавой камісіі, паказвае, што на працягу 5 год якасная паспяховасць состаўляе 95%.

**Заключэнне.** Такім чынам, цэласнае адукацыйнае ассяроддзе прапаноўвае настаўнікам, як актыўным суб'ектам прафессійнага развіцця разнастайныя варыянты дзеянняў, спрыяе удасканальванню прафессінай і практычнай падрыхтоўкі навучэнцаў. Традыцыйная сістэма, якая склалася у каледжы, дазваляе паспяхова вырашаць задачы практычнай падрыхтоўкі выпускнікоў да рэалій падагагічнай работы. Разам з тым, хутка мадэрнізавальнае адукацыйнае асяроддзе прымушае шукаць новыя шляхі павышэння якасці падрыхтоўкі спецыялістаў дашкольнай адукацыі, прадумваць разнастайныя формы сумеснай дзейнасці настаўніка з навучэнцамі.

Літаратура

1. Образовательный стандарт Республики Беларусь. Среднее специальное образование. Специальность 2 - 01 01 01 Дошкольное образование. Квалификация «Воспитатель дошкольного образования» / Постановление Министерства образования Республики Беларусь 15.03.2019 г. № 24 / Национальный реестр правовых актов РБ 29 мая 2019 г. № 8/34198.

2. Холодов Ж.К., Кузнецов В.С. Теория физического воспитания и спорта: Учеб. пособие. М.: Изд. центр «Академия», 2000. 480 с.

3. Максименко А.М. Теория и методика физической культуры: учебник для вузов физической культуры / А.М. Максименко. – 2-е изд, испр. и доп. – М.: Физическая культура, 2009. - 496 с.

4. Данич, О.В. Формирование профессиональных компетенций у будущих педагогов в условиях высшего профессионального образования / Н.И.Бумаженко, О.В.Данич, С.А.Карташёв / / Вестник Академии знаний. – 2013. - № 2 (5). – С. 104-109.